семьи. Сформировавшаяся общность семейных убеждений, улучшения во взаимопонимании, навыки грамотного поведения в конфликтных ситуациях, преодоление тревожностей и фобий, внимательное отношение к интересам ребенка позволяют всем членам семьи стать значительно адаптивнее, приобрести уверенность в собственных силах и жизнестойкость.

Подводя итоги вышеизложенного, можно сделать следующие выводы:

– на основании анализа нормативной базы и изучения критериев и показателей нахождения несовершеннолетних и семей в социально опасном положении, мы можем утверждать, что социально опасное положение выступает следствием ненадлежащего исполнения родителями установленных законом функций первичного социального контроля, что ставит под угрозу жизнь, здоровье, психологическое благополучие, гармоничное развитие ребенка и является триггером возникновения различных деструктивных явлений(девиантное поведение, зависимости, безнадзорность, правонарушения);

– семьи, находящиеся в социально-опасном положении в большинстве классификаций характеризуются негативными особенностями психологических портретов разных поколений, которые необходимо и возможно корректировать грамотной и своевременной помощью социально-психологических служб с перспективой благоприятного прогноза развития семьи;

– психологическое благополучие всех членов семьи является мультикомпонентным и включает в себя материальное благополучие, вовлеченность в жизнь общества, заботу о физическом здоровье членов семьи, сформированность гармоничной внутрисемейной системы общих ценностей и установок;

– снижение количества детей и их законных представителей, находящихся в социально-опасном положении может быть достигнуто посредством своевременной психокоррекционной работы, что будет способствовать укреплению здоровья нации и созданию перспектив сохранения общенациональных традиций и ценностей.

Литература


1. Бестужев-Лада, И. Д. Ступени к семейному счастью / И. Д. Бестужев-Лада. – М. : Мысль, 1985. – 244 с.
2. Социально-экономические факторы детерминации преступного поведения несовершеннолетних : монография / М. В. Горбачев, Т. А. Ермолаева, Е. В. Ильгова [и др.] ; под общ. ред. И. О. Кузнецовой. – Саратов : ФГБОУ ВО «Сарат. гос. юрид. акад.», 2017. – 348 с.
3. Ганишина, И.С. Психологическое влияние неблагополучной семьи на девиантное поведение несовершеннолетних : автореф. … дис. канд. психол. наук : 19.00.06 / Ганишина Ирина Сергеевна ; Акад. права и управления Минюста России. – Рязань, 2004. – 28 с.
4. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Минск, 2003–2024. – URL: http://www.pravo.by.


УДК 398(06)

## СІМВОЛІКА ЧЫРВОНАГА КОЛЕРА Ў НАРОДНАЙ СЛОВАТВОРЧАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

**У. А. Іўко**

*Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янки Купалы», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік Т. А. Піваварчык

*У артыкуле абмяркоўваецца месца чырвонага колеру ў так званым “этнічным колеравым менталітэце” беларускага народу. Разглядаюцца беларускія сямейныя абрада-*

*выя песні, у якіх выкарыстоўваецца колеранайменне чырвоны; выяўляецца, з якой канатацыяй выкарыстоўваюцца словы чырвоны і красны ў беларускіх сямейных абрадавых песнях.*

**Ключевые слова:** беларуская міфалогія, чырвоны колер, сімволіка колеру, колеравы код нацыянальнай культуры, этнічны колеравы менталітэт.

## THE SYMBOLISM OF THE COLOR RED IN THE FOLK VERBAL CULTURE OF BELARUSIANS

**U. A. Ivko**

*Yanka Kupala State University of Grodno, Republic of Belarus*

Scientific supervisor T. A. Pivavarchyk

*The article discusses the place of the color red in the so-called “ethnic color mentality” of the Belarusian people. Belarusian family ritual songs that use the color name red are examined; the connotation with which the words red and red are used in Belarusian family ritual songs is revealed.*

**Keywords:** belarusian mythology, red color, color symbolism, color code of national culture, ethnic color mentality.

У кожнага народа карціна свету і адпаведныя ёй стаўленне да жыцця маюць сваю нацыянальна-культурную спецыфіку. Так, даследчыкі адзначаюць, што для менталітэту беларусаў характэрныя такія асаблівасці, як надзвычайная цярплівасць, цягавітасць і неагрэсіўнасць у адносінах як да “сваіх”, так і да “чужых” [4, с. 69], “неканфрантацыйная сацыяльная ўстаноўка і замяшчэнне паняцця свабоды паняццем агульнай волі”, патэрналізм і клопат пра дзяржаву [1, с. 290], здольнасць беларусаў ахвяраваць імгненнымі выгодамі дзеля важнейшых доўгачасовых інтарэсаў. Выключную ролю ў выяўленні светапогляду народа, яго каштоўнасных прыярытэтаў, традыцый у арганізацыі паўсядзённага жыцця, а таксама рытуалізацыі яго святочных і трагічных момантаў адыгрывае сімволіка колеру. Людзі са спрадвечных часоў надавалі асаблівае значэнне сэнсавай інтэрпрэтацыі колеру, што знайшло адлюстраванне ў старажытных міфах, містычных вучэннях, народных паданнях, прыказках і фразеалагізмах, у лексічным складзе кожнай нацыянальнай мовы. У сваёй аснове сімволіка колеру абапіраецца на асацыяцыі і псіхафізіялагічныя асаблівасці ўспрымання колеру. Па звестках многіх даследчыкаў, колеравы культурны код беларусаў складаецца з такіх колераў, як белы, блакітны, зялёны, ружовы, сіні, чорны, чырвоны, шэры. Аде пры гэтым чырвоны колер разам з белым і чорным утвараў асноўны спектр колеравай сімволікі традыцыйнай культуры беларусаў і адыгрываў выключную ролю ў светапоглядзе нашых продкаў.

Мэта артыкула – вызначыць і абагульніць асноўныя сімвалічныя сэнсы чырвонага колеру ў фальклорнай творчасці беларусаў. Асноўным матэрыялам назіранняў выступаюць сямейна-абрадавыя песні, сабраныя Т. Б. Варфаламеевай у кнізе “Сямейныя абрады і звычаі”. Тэарэтыка-метадалагічную аснову даследавання складаюць працы беларускіх культуролагаў, лінгвістаў, этнографаў, літаратуразнаўцаў, прысвечаных нацыянальна-культурнай інтэрпрэтацыі колеру (І. А. Швед, І. І. Крук, Т. В. Валодзіна, М. І. Канюшкевіч, Г. В. Горава, Ю. М. Бабіч, А. А. Шарэйка, І. І. Жылінская і інш.).

Добрай крыніцай для аналізу сімвалічнасці колераў і прадметаў пэўнага колеру з’яўляецца кніга “Сямейныя абрады і звычаі”, дзе сабраныя шматлікія песні, звязаныя з галоўнымі этапамі ў жыцці чалавека: нараджэннем, вяселлем і пахаваннем. Але слова *чырвоны* выкарыстоўваецца ў адносна невялікай колькасці песень,

якія ў большасці звязаныя з абрадамі, што праводзіліся падчас вяселля. Даволі часта корань слова *чырвоны* фігуруе ў назве манеты чырвонца, што мае на ўвазе літаральнае выкарыстанне слова і ў той жа час звязана з сімвалічнасцю дарэння падарункаў як сацыяльна і культурна значнага аспекту міжасобасных адносін. *Чырвонец* паяўляецца ў абрадавых песнях, звязаных з вяселлем – у якасці платы за нявесту: *Я ж далоў ні зьлячу / І дамоў ні пайду, / Я ж за гэты куток / Заплаціў* ***чырванцок*** (в. Ламанцы, Крупскі раён) [2, с. 145]; *Не паложыця* ***чырвонца****, / Не пусьцім за стол малойца…* (в. Бяседавічы, Хоцімскі раён) [2, с. 370]; *Не гніся, сватко, не гніся, / Кладзі* ***чырвонец****, садзіся. / Кладзі* ***чырвонец****, шчэй другі, / Бо наш букецік дарагі* (в. Рудня Мілкаўская, Мазырскі раён) [2, с. 377]; *Братачка ідзе,* ***чырвончык*** *нясе, / Цяпер мы дарыць будзім. / А не дарыця, панаравіця, / Пакуль сястрыца прідзя…* (в. Селішча, Барсаўскі раён) [2, с. 481].

Таксама словы «чырвоны» ці «красны» выкарыстоўваюцца ў вясельна-абрадавых песнях для апісання прыгажосці дзяўчыны, якая ў будучыні павінна стаць нявестай: *Выйдзі, павыйдзі,* ***красна*** *Танічка, к нам, да нас, / А спызнай, спызнай свайго Колічку міжду нас…* (в. Селішча, Барысаўскі раён) [2, с. 361]; *Вунесь, маці, дзежку, / Сын прывёз нявестку. / Тонку, высокую, / Сьлепу, безокую. / Тонку, як буліна, /* ***Чырвону****, як каліна* (в.Тонеж, Лельчыцкі раён) [2, с. 442]; *Пушов батэнько – нэ знайшов, / Вырвав квіточку, то й прышов. / Квітко моя* ***чырвоная****, / Дытынко муя молодая, / Кому ты сужоная?* (в. Знаменка, Брэсцкі раён) [2, с. 474]. У дадзеных кантэкстах слова *чырвоны* выкарыстоўваецца ў якасці сіноніма да слова *прыгожы*.

Трэба адзначыць распаўсюджанае параўнанне дзяўчыны з чырвонай калінай і адасобленую ад вобраза нявесты прысутнасць дадзенай расліны ў тэкстах абрадавых песень: *Сівая зеўзюлечка. / Ці ты жалуеш раньне летаньне, / Познае жыраваньне? / Познае жыраваньне. / Ці ты жалуеш цёмнага луга / Ці* ***чырвону каліну****?* (в. Бяланавічы, Петрыкаўскі раён) [2, с. 535]. Можам выдвінуць гіпотэзу аб пазітыўнай канатацыі прысутнасці ў тэксце вобраза *чырвонай каліны*, спасылаючыся на работу І. Швед «Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры». Аўтар сцвярджае, што некаторыя з лекавых раслін лічыліся дзейнымі нашымі продкамі не толькі з-за сапраўдных лекавых якасцяў, правераных вопытам, але і з-за чырвонага колеру расліны, яе расцёртых пялёсткаў ці зробленых з яе адвараў, мазяў. Гэта нібы радніць расліну з крывёю і абумаўляе яе выкарыстанне супраць хвароб, так ці інакш звязаных з кроўю [5, с. 128]. Яшчэ адзін кантэкст звязаны з момантам, калі будучая нявеста кланяецца ў ногі бацьку ў чырвоных ботах. Можам трактаваць гэта як падкрэсленую святочнасць падзеі: *А ня стой, татычка, далёка, / А ня стой, подненькі далёка. / А стань, татычка, блізенька, / А стань, родненькі блізенька. / Паклынаюся табе нізенька, / Праклынаюсь, родненькі, нізенька. / А нізка, нізка ды ў ножкі, / А ў* ***чырвоныя сапожкі****…* (в. Бяседавічы, хоцімскі раён) [2, с. 517–518]. Цікавы кантэкст у адной з песень вясельнага цыкла – параўнанне бацькі з *красным сонцам*. У дадзеным прыкладзе выкарыстанне слова *красны* мае выключна станоўчую канатацыю: *Нівясёлы дзень / Без* ***краснага сонца****. / Нівясёлы пір / Без роднага таткі…* (в. Вярэчча, Гарадоцкі раён) [2, с. 452].

Чырвоны колер адыгрывае выключную ролю ў вясельных абрадах і песнях. Гэта адзначае ў сваёй кнізе «Сімволіка беларускай народнай культуры» Я. Крук, узгадваючы каравай як адзін з галоўных атрыбутаў беларускага вясельнага абраду. Каравай сімвалізаваў жыццесцвярджальнае радавое адзінства, пачатак новага жыццёвага цыкла ў бясконцым родавым ланцужку. Вясельныя песні, што гучалі падчас прыгатавання каравая і асабліва ў той момант, калі яго даставалі з печы, засяроджвалі ўвагу на ідэалізаванай характарыстыцы жанчын-каравайніц; далей

у адпаведнасці з прынцыпам псіхалагічнага паралелізму гэтыя ж якасці пераносіліся на каравай, які быццам бы мадэліраваў і праграміраваў шкалу каштоўнасцей і духоўную арыентацыю мікракосмасу будучай сям'і. Часцей за ўсё асноўным колерам, які характарызаваў сэнсава-змястоўны аспект каравая, быў *чырвоны*: Ой, харошы каравай, харошы, / Знаю, яго харошыя рабілі. / Ой, удалы каравай, удалы, / Знаю, яго ўдалыя рабілі. / Ой, ***чырвоны*** каравай, ***чырвоны***, / Знаю, яго ***чырвоныя*** рабілі [3, с. 74].

Аналізуючы песні, сабраныя Т. Б. Варфаламеевай у яе рабоце "Сямейныя абрады і звычаі", трэба адзначыць, што чырвоны колер не ўзгадваецца ў песнях, звязаных з абрадам пахавання. Гэта нядзіўна, бо традыцыйна са смерцю і нябожчыкам асацыюецца белы колер. Напрыклад, цяжарную жанчыну нельга было цалваць нябожчыка ці прыводзіць яе на могілкі, бо дзіця будзе белае, як пакойнік. Трэба было павязаць жанчыне на жываце чырвоную нітку ці чырвоны пояс, які аберагаў бы яе ад нячыстага ці смяротнага [5, с. 138].

Такім чынам мы можам зрабіць выснову аб пазітыўнай канатацыі выкарыстання чырвонага колеру ў беларускіх сямейна-абрадавых песнях. Слова *чырвоны* выкарыстоўваецца ў значэнні 'прыгожы', указвае на святочнасць падзеі ці стварае пазітыўную асацыяцыю з чалавекам. Таксама чырвоны выкарыстоўваецца ў прамым значэні ў найменні валюты *чырвонец*, але нельга не адзначыць, што платай *чырвонцам* суправаджаецца з'яднанне маладых, з'яднанне сям'і, выкуп нявесты. Агулам чырвоны колер у абрадавых песнях беларусаў як часткі народнай словатворчай культуры выкарыстоўваецца з пазітыўнай канатацыяй.

Літаратура


1. Боярчук, Т. Н. Влияние исторического прошлого на менталитет белорусов / Т. Н. Боярчук // Історичні і політологічні дослідження. – 2012. – № 1. – С. 280–291.
2. Варфаламеева, Т. Б. Сямейныя абрады і звычаі / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Выш. шк., 2017. – 719 с.
3. Крук, Я. Сімволіка Беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2003. – 350 с.
4. Мельнікаў, А. Характар і менталітэт беларусаў / А. Мельнікаў // Беларуская думка. – 1997. – № 7. – С. 67–72.
5. Швед, І. А. Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2011. – 291 с.


УДК 373.3.016:51

# РЕАЛИЗАЦИЯ ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ ФУНКЦИИ ПРИ ОБУЧЕНИИ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ МАТЕМАТИКЕ

**К. В. Карпенкова**

*Учреждение образования «Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова», Республика Беларусь*

Научный руководитель Т. В. Гостевич

*Раскрыт один из аспектов реализации воспитательной функции при обучении младших школьников математике. Подчеркнута важность формирования чувства патриотизма на I ступени общего среднего образования. Описывается фрагмент работы с электронным средством обучения «Могилев: город доблести и славы».*

**Ключевые слова:** воспитательная функция, патриотизм, обучение, младшие школьники, математика.